…ЗАДАЧА ЗАКЛЮЧАЕЦЦА Ў ТЫМ, КАБ ВУЧЫЦЦА

У. І. ЛЕНІН

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 25 (716) Пятніца, 13 верасня 1968 г. Год выдання XXI Цана 2 кап.

*Гэтыя ленінскія словы сталі праграмай дзейнасці камсамольскіх пакаленняў савецкага народа.*

*У аўдыторыях і лабараторыях, на калгасных нівах і будаўнічых пляцоўках моладзь нашай краіны вучыцца камунізму.*

## ЗАКОН НАШАГА ЖЫЦЦЯ

М. ЦІВА,
*САКРАТАР КАМІТЭТА КАМСАМОЛА*

У кожнага ўзросту свае законы, у кожнага новага пакалення моладзі свае характэрныя рысы. Пэўны час уздзейнічае на асаблівасці ўзросту пакалення, пакідаючы на ім свой адбітак эпохі.

Але ёсць у нашай савецкай моладзі адзін агульны закон жыцця, які пранізаў усе яго пакаленні. Давайце пакінем на хвіліну знешнія атрыбуты эпох 20—40 — 60 гадоў: рэвалюцыйныя песні і сабельны свіст, віхуры жорсткіх схватак з азвярэлым фашызмам, гоман мірных будоўляў, свет касмічнай эры, — і мы ўбачым той адзіны стрыжань, які пранізаў усе пакаленні, тую агульную рысу, якая характарызуе нашу моладзь. Гэта рыса — самаадданасць ідэі. Гэта — адзіны закон савецкай моладзі. Ён рухаў і рухае моладзь на ратныя і працоўныя подзвігі. Народжаны ён рэвалюцыйнай эпохай.

Успомнім камсамольцаў 20-х гадоў. Хлапчукамі станавіліся яны на чале палкоў і ўездаў, рваліся наперад і білі ўпэўнена, адчуваючы, што менавіта ад іх удараў пераварочваецца свет. Тады, у віхуры рэвалюцыйнай эпохі, якая сарвала ўсё з месц, маланкай зыркала вялікая ідэя —ідэя смяротнай барацьбы са старым светам. Яна кавала ў моладзі асаблівы рамантычны склад душы і здзіўляючую гатоўнасць да самаахвяравання. Яны былі першымі, юнакамі бачылі смерць зблізку, юнакамі здзяйснялі подзвігі. Першае пакаленне не ўздрыгнула. Яно аказалася дастойным тых вялікіх ідэй, на якіх яго выхоўвала партыя.

А Зямля працягвала бушаваць. Будаўніцтва амаль на пустым месцы, тачкай і лапатай, першынцаў індустрыі, вялікія культурныя пераўтварэнні, падрыхтоўка да бою з фашызмам, які рваўся да ўлады і, нарэшце, другая сусветная вайна — гэта толькі асноўныя вехі ўзмужання новага пакалення. У гэты складаны час, калі бушавала вялікая віхура чалавечых пакаленняў, нараджаліся і гераічныя сітуацыі.

І другое пакаленне з гонарам вытрымала не менш цяжкі экзамен. Яно вызначыла свае адносіны да жыцця і да канца абараняла заваёваную бацькамі свабоду.

На долю цяперашняга пакалення выпаў таксама складаны перыяд грамадскага развіцця. Але наша юнацтва пачынае свой пошук не з чыстай старонкі. Наша юнацтва — гэта духоўныя нашчадкі пакаленняў 20—40 гадоў. Яно ўзяло ў спадчыну мэтанакіраванасць тых, хто будаваў нашу савецкую радзіму і абараняў яе ад ворагаў.

Жыццёвы пошук сённяшняга пакалення юнакоў і дзяўчат вядзецца ў пэўным кірунку — у імкненні актыўна ўдзельнічаць у барацьбе за камуністычныя ідэалы. На нашу долю выпала вялікае шчасце — працягваць рэвалюцыйную справу бацькоў і дзядоў. Мы будуем камунізм. А гэта — вялікае рэвалюцыйнае пераўтварэнне грамадства. Значыць—рэвалюцыя працягваецца. Працягваем яе мы. Вядзе нас партыя Леніна.

Новы пяцігадовы план прапаноўвае нам такія рубяжы, якія патрэбна браць з боем. Ён злучае ў сабе і гарачую рамантыку бацькоў і цвярозы навуковы разлік касмічнага века. Наперадзе рыштаванні новабудоўляў, сінеча новых прастораў і тысячы няпройдзеных сцежак. Але за кожны свой крок сёння мы заўтра будзем адказваць перад сваімі дзяцьмі, перад новым пакаленнем, і ў нас ёсць аб чым сказаць сёння. 230 Усесаюзных ударных камсамольскіх будоўляў, 10 тысяч кіламетраў электрыфікаваных дарог, тры тысячы новых чыгуначных дарог, Брацкая ГЭС, камсамольскія гарады — Амурск, Брацк, Дзіўнагорск, Шэлехава, Качкачар, Жалезнагорск, трохсоттысячны студэнцкі будаўнічы атрад — вось што такое сёння камсамол у лічбах. Але ёсць у нас справы і клопаты, якія цяжка выказаць у лічбах. Гэта—вялікая выхаваўчая роля камсамола ў жыцці нашага грамадства. У камсамоле знаходзяцца прадстаўнікі таго кантынгенту насельніцтва, якія па сіле ўзроставых

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*





## КАМСАМОЛЬЦЫ. НАВУКА. ЧАС.

*Камсамольская арганізацыя універсітэта ў 1924 годзе налічвала 250 камсамольцаў. Яна была раздзелена на факультэцкія ячэйкі. Гэта яшчэ больш садзейнічала ўздыму палітыка-выхаваўчай работы на ўсіх факультэтах.*

*У 1926 годзе ў БДУ было 359 камсамольцаў, а ў 1930 — 740. Ва універсітэцкую камсамольскую арганізацыю ўваходзілі камсамольскія арганізацыі факультэтаў, акрамя рабочага. Улічваючы спецыфіку работы гэтага факультэта, тут была створана асобная камсамольская ячэйка.*

*Пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі камсамольцы на прадпрыемствах і ва ўстановах праводзілі рэйды «лёгкай кавалерыі» супраць бюракратызма, безгаспадарлівасці, антысанітарыі.*

*Універсітэт шэфстваваў над Сёмай кавалерыйскай дывізіяй і над Аб'яднанай школай камсастава РККА. Там студэнты кіравалі палітгурткамі, рыхтавалі жадаючых паступіць на рабочы факультэт і ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.*

*Сваёй важнейшай справай камсамольская арганізацыя універсітэта лі-*

(Заканчэнне на 3-й стар.)

## *ВАЖАКІ УНІВЕРСІТЭЦКАЙ КАМСАМОЛІІ*

Моладзь і старэйшае пакаленне нашага народа рыхтуюцца ўрачыста адзначыць у гэтым годзе знамянальны юбілей — 50-годдзе Ленінскага камсамола. Гісторыя камсамольскай арганізацыі нашага універсітэта поўная цудоўных спраў, і кожная яе старонка звязана з імёнамі тых, хто стаяў на чале арганізацыі, сваёй энергіяй, запалам, працавітасцю зацікаўліваў студэнцкую моладзь на добрыя справы.

Многія з былых сакратароў камітэта камсамола сталі вучонымі, партыйнымі работнікамі, выхавацелямі студэнцтва і цяпер ідуць у першых радах будаўнікоў камунізма. Памятае універсітэт сваіх камсамольскіх важакоў Д. Мельцэра, цяпер дацэнта гістфака, Н. Каўшову, якая настаўнічае ў горадзе Орша, А. Шлыка, які сёння прафесар біялагічнага факультэта, член-карэспандэнт Акадэміі Навук СССР.

Прайшлі школу камсамольскай работы ва універсітэце Ю. А. Васільеў, загадчык кафедры філасофіі Мінскага педагагічнага інстытута замежных моў, дацэнт кафедры навуковага камунізма гістарычнага факультэта універсітэта А. Д. Гусеў і дацэнт кафедры гісторыі КПСС гэтага ж факультэта Н. П. Хрыпко, дацэнт факультэта замежных студэнтаў палітэхнічнага інстытута Л. І. Валаховіч і супрацоўнік ЦК КПБ дацэнт Е. М. Бабосаў, кандыдат гістарычных навук Р. А. Малюковіч і многія іншыя.

Дастойна нясе эстафету сваіх папярэднікаў цяперашняе пакаленне камсамольскіх актывістаў. Яно запаўняе сучасныя старонкі летапісу камсамольскіх спраў універсітэта.

**Е. ІВАНЮЦЕНКА,**
**лабарант.**



# ЗАКОН НАШАГА ЖЫЦЦЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

прычын павінен змяніць старэйшае пакаленне, даваць партыі новыя, свежыя сілы. Камсамол — рэзерв партыі і яе памочнік. За 50 гераічных год 90 мільёнаў савецкіх людзей прайшлі школу камсамола. Кожнага дзесятага — 9 мільёнаў чалавек — камсамол перадаў за гэты час камуністычнай партыі. Праграмай дзейнасці для нас была і застаецца прамова У. І. Леніна на трэцім з'ездзе камсамола. Звяртаючыся да камсамольцаў, Уладзімір Ільіч сказаў: «Вы павінны выхоўваць з сябе камуністаў... Толькі ў працы разам з рабочымі і сялянамі можна стаць сапраўднымі камуністамі».

На ўсім сваім далейшым шляху камсамол будзе выконваць ленінскія запаветы, будзе апраўдваць надзеі партыі, з гонарам выконваць свае пачэсныя абавязкі яе памочніка і рэзерва.

Слаўны юбілей Ленінскага камсамола 8-тысячная арганізацыя універсітэта сустракае добрымі поспехамі. Летам гэтага года толькі на добра і выдатна закончылі трэці семестр байцы 52 студэнцкіх будаўнічых атрадаў універсітэта. Нашы рабяты працавалі ў Цюмені, Мурманску, Эстоніі, Казахстане, будавалі ў роднай Беларусі..

Цяпер у арганізацыі разгарнулася вялікая падрыхтоўка да свята. Рыхтуецца «Летапіс камсамольскай славы універсітэта», партрэтная галерэя лепшых актывістаў, на свята будуць запрошаны ўсе сакратары камітэта камсамола універсітэта за ўсе 47 год яго існавання. Лепшыя камсамольцы-актывісты будуць узнагароджаны граматамі, каштоўнымі падарункамі, сфатаграфаваны ля разгорнутага сцяга арганізацыі.

«Пройдуць гады, і нашчадкі нашы будуць славіць гераізм цяперашніх пакаленняў, іх мэтанакіраванасць у барацьбе за сцвярджэнне сацыялістычных ідэалаў на зямлі,» — так гаварылася ў справаздачным дакладзе ЦК КПСС XXIII з'езду партыі.

І мы ўпэўнены, што будзе так.



НА ЗДЫМКУ: студэнты хімфака нашага універсітэта 1940—1941 года навучання, якія ў першыя дні вайны пайшлі на фронт: (злева направа). А. Х. Клецкін, В. Ф. Бяляеў, Ф. І. Аўрамчыкаў, І. С. Старобінец, Б. Мядвінскі, П. Х. Самафалаў.

## ЯНЫ Ў БАЯХ ЗАВАЯВАЛІ СЛАВУ

Камсамольская арганізацыя Беларускага дзяржаўнага універсітэта можа ганарыцца іменамі многіх сваіх выхаванцаў. Сотні з іх, як і камсамольскі сакратар Абрам Фердэр, аддалі сваё жыццё за незалежнасць любімай Радзімы. Назаўсёды застануцца ў памяці таварышаў светлыя вобразы камсамольцаў гістарычнага факультэта Мікалая Бабчынскага і Афанасія Наліваікі — добраахвотнікаў - дэсантнікаў, якія загінулі ў час вызвалення роднай Беларусі.

Слаўны баявы шлях прайшоў член камітэта камсамола універсітэта Леанід Сокал. Ён быў студэнтам гістарычнага факультэта, выдатнікам вучобы і атрымліваў стыпендыю імя 20-годдзя камсамола. Яго жыццё абарвалася на снежных прасторах пад Мажайскам у час адбіцця танкавай атакі праціўніка.

Пад Ленінградам загінуў смерцю храбрых студэнт геаграфічнага факультэта камсамолец Мікалай Кукарэка.

Слаўная старонка ваеннай гісторыі універсітэта звязана з баявой дзейнасцю сакратара камсамольскай арганізацыі БДУ Івана Рыбакова. Ён нарадзіўся і вырас у вёсцы Гарадокскага раёна Віцебскай вобласці. Пара юнацтва застала яго ў сценах Віцебскага педагагічнага вучылішча. У 1931 годзе ён закончыў яго і стаў настаўнікам.

У 1935 годзе Іван Рыбакоў паступіў на гістарычны факультэт універсітэта. З таго часу прайшло многа год. Яго аднакурснікі ўжо пакрыліся сівізной. Але яны не забылі Івана. З яго імем звязана нямала цудоўных спраў, якія ў той час заносіў у сваю капілку камсамольскі камітэт універсітэта.

Вайна перашкодзіла Івану здзейсніць многія яго мары і планы. У спіску добраахвотнікаў, што пайшлі на вайну, яго імя было ў ліку першых.

Савецкае камандаванне даверыла Івану Рыбакову выкананне важнай адказнай задачы па разведцы ў тыле ворага. Разведчык Іван Рыбакоў дзейнічаў на тэрыторыі роднай Беларусі. Знаходзячыся тут, ён дазнаваўся аб перамяшчэнні нямецкіх часцей, збіраў даденыя аб нямецкіх гарнізонах. Ва ўмоўлены час з дапамогай магутнага радыёперадатчыка Іван Рыбакоў перадаваў гэтыя важныя звесткі ў Маскву.

14 верасня 1943 года Іван Рыбакоў паспяхова выканаў заданне і павінен быў вярнуцца ў сталіцу Радзімы. За бліскучае выкананне баявога даручэння Савецкае камандаванне прадставіла Івана Рыбакова да узнагароды, але атрымаць яе яму не ўдалося. Ён загінуў у час вяртання ў Маскву.

Многія студэнты і выкладчыкі універсітэта ў гады Вялікай Айчыннай вайны сталі ўдзельнікамі партызанскага руху.

*Е. БАРАНОЎСКІ.*



# КАМСАМОЛЬЦЫ 50-Х ГАДОЎ

Слова «камсамол». Колькі прыемных успамінаў асацыіруецца з ім! Яно напамінае аб маладосці, аб рамантычных і гераічных справах, аб імкненні да ўсяго новага, да вышынь навукі, да пазнання жыцця. І гэта справядліва ў адносінах да любога перыяду слаўнай гісторыі ленінскай маладой гвардыі. Гэтыя слаўныя рысы былі ўласцівы камсамолу заўсёды: у гады змаганняў на франтах грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войн, у цяжкія гады аднаўлення народнай гаспадаркі і тым больш у гады бурлівага росквіту нашай эканомікі, навукі і культуры.

Многія з гэтых якасцей былі ўласцівы і нашай камсамольскай групе. На першы курс аддзялення філасофіі ў 1949 годзе прыйшлі камсамольцы з розных куткоў нашай рэспублікі. Адны з іх былі старэйшымі, апаленыя порахам нядаўна пераможна закончанай вайны, іншыя яшчэ зусім маладыя. Ваня Сцяпанаў з Віцебшчыны прыйшоў ва універсітэт у 16 год. Але і ён ужо меў за плячыма вопыт перажытых нястач і пакут.

Маладая камсамольская сям'я хутка згуртавалася, арганізавалася для вырашэння надзённых задач. Забурліла жыццё, узрушыўся дапытлівы розум, разгарнулася разнастайная і цікавая дзейнасць. Гарачыя спрэчкі і дыскусіі зацягваліся на цэлыя тыдні на семінарскіх занятках, камсамольскіх сходах, у пакоях інтэрнатаў. Заўсёды і ўсюды заўважалася незвычайнае імкненне, смага да ведаў. Здаецца, што ўжо тады па інтуіцыі мы разумелі, што наша камсамольская работа павінна быць узорам для ўсёй моладзі, што задачы камуністычнага выхавання, падрыхтоўкі энергічных і ўмелых будаўнікоў камуністычнага грамадства, абаронцаў Савецкай краіны павінны быць падпарадкаваны ўсёй практычнай дзейнасці камсамола. Менавіта тут, у сценах універсітэта, у працэсе ўпартай вучобы мы глыбей усведамлялі запавет Уладзіміра Ільіча, што трэба вучыцца камунізму, засвойваць усё багацце чалавечых ведаў.

Камсамольцы нашай групы, нягледзячы на пэўныя цяжкасці, а іх было больш, чым цяпер, свята выконвалі запавет нашага любімага правадыра. Пераважная большасць камсамольцаў вучылася толькі на добра і выдатна, адзінаццаць чалавек атрымалі дыпломы выдатніка. І пасля заканчэння універсітэта многія з іх працягвалі вучобу. Да цяперашняга часу 9 выпускнікоў нашай групы — А. А. Бірала, В. А. Васільеў, Г. М. Грынберг, М. І. Іоська, М. В. Окунь, А. А. Ракаў, В. Н. Сяўрук, І. А. Сцяпанаў — абарнілі кандыдацкія дысертацыі. Яшчэ сем чалавек — А. А. Галаўня, Н. Н. Махнач, В. А. Нядзелька, В. І. Пазнякоў, Н. І. Пазнякова, Г. С. Рубіс, Н. У. Філімоненкаў—працуюць у вну і навукова-даследчых інстытутах.

Імкненне да ведаў, упартасць і працавітасць, выхаваныя ў нас слаўным камсамолам, прынеслі свой плён. Яны і сёння памнажаюць нашы сілы ў пачэснай працы на карысць нашай Радзімы.

А. КЛЯЎЧЭНЯ,
кандыдат гістарычных навук, камсамолец з 1940 года.

# ІСКРА ДУШЫ

Мабыць, кожнаму ў жыцці лёс дорыць сустрэчу з цудоўным чалавекам. Яна можа быць мімалётнай ці звяжа людзей на доўгія гады. Моцна пашанцуе ў апошнім выпадку, таму што тады іскра душы, розуму, таленту аднаго азарыць многіх.

А іскра душы прафесара Міхаіла Аляксандравіча Ельяшэвіча пасяліла агонь служэння навуцы ў тысячах маладых сэрцаў.

Выхаванец Ленінградскага універсітэта, а потым і яго выкладчык, вучань Раждзественскага, малодшы саратнік Вавілава, Сямёнава, Курчатава, Міхаіл Аляксандравіч, атрымаўшы загартоўку ў першакласных навуковых школах, сам плённа працуе і выхоўвае камсамольскае племя фізікаў. Яго выдатныя дасягненні ў галіне тэарэтычнай фізікі адыгралі вялікую ролю ў развіцці айчыннай навукі і вытворчасці, ва ўмацаванні абароннай магутнасці нашай Радзімы.

З 1956 года Міхаіл Аляксандравіч працуе ў Мінску, становіцца раданачальнікам раду кірункаў у школе беларускіх фізікаў і ў той жа час вучыць усё новыя і новыя пакаленні студэнтаў. Выключнае педагагічнае майстэрства, шырыня інтарэсаў і высокая якасць лекцый здабылі Міхаілу Аляксандравічу ўдзячную любоў вучняў.

Манаграфіі М. А. Ельяшэвіча сталі сапраўднай энцыклапедыяй ведаў, а яго працы ў галіне спектраскапіі адкрылі новыя гарызонты сусветнай навукі.

Пяць тысяч выпускнікоў фізічнага факультэта нашага універсітэта прайшлі школу выдатнага вучонага. Многія з іх паспяхова ўкараняюць у практыку ідэі свайго настаўніка, ўзбагачаюць навуку новымі дасягненнямі.

Лаўрэат дзвюх Дзяржаўных і Ленінскай прэмій, Міхаіл Аляксандравіч Ельяшэвіч узнагароджан ардэнамі Леніна, «Знак Пашаны» і зусім нядаўна ўдастоен яшчэ адной узнагароды—ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга.

У гэтыя дні універсітэт, навуковая грамадскасць Мінска, госці з Масквы і Ленінграда, вучні з розных куткоў Саюза цёпла адзначылі 60-годдзе з дня нараджэння і 40-годдзе навуковай і педагагічнай дзейнасці загадчыка кафедры атамнай і малекулярнай фізікі фізічнага факультэта нашага універсітэта акадэміка АН БССР, доктара фізіка-матэматычных навук прафесара М. А. Ельяшэвіча.

Рыхтуючыся да юбілею камсамола, студэнцтва універсітэта аддае даніну глыбокай павагі свайму настаўніку, камуністу, які мужаў з камсамолам, каваў маладыя навуковыя сілы.

НА ЗДЫМКУ: прафесар М. А. Ельяшэвіч адказвае на віншаванні.

Фота Д. ПРЭСА.

## СА СТАРОНАК ГІСТОРЫІ

# КЛУБ ДРУЖБЫ

*Пасля VI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Вене ў 1959 годзе было вырашана стварыць клубы дружбы і міжнароднай сувязі з моладдзю замежных краін. Такі клуб быў створаны ў нас ва універсітэце пры камітэце камсамола.*

*...У адрас камітэта камсамола пачалі прыходзіць пісьмы з самых розных краін свету. У іх нашы сябры цікавіліся, як мы працуем, адпачываем, як працуюць нашы навуковыя гурткі і калектывы мастацкай самадзейнасці.*

*Вось, напрыклад, радкі аднаго з пісем ад венгерскага сябра: «Мы любім і паважаем савецкіх людзей, якія з'яўляюцца для нас жывым прыкладам ва ўсім. Мы вывучаем вашы навуковыя дасягненні, самыя перадавыя ў свеце, і ўпэўнена ідзем па шляху, які ўказаў нам Ленін».*

*Гэта быў першы клуб у нашым горадзе.*

# ЭСТАФЕТА ПАКАЛЕННЯЎ

Паважаныя таварышы!

Дазвольце праз вашу газету ад імя калектыва рабочых будаўнічага ўпраўлення № 4 трэста «Белтрактарбуд» падзякаваць студэнтаў 1-га курса аддзялення журналістыкі Белдзяржуніверсітэта за добры канцэрт мастацкай самадзейнасці, які яны наладзілі 17 лістапада.

Рабочыя - будаўнікі сталіцы спадзяюцца яшчэ не раз сустрэцца са сваімі шэфамі-студэнтамі універсітэта.

І. ІВАШЧАНКА,
сакратар партарганізацыі.
(«Беларускі універсітэт», № 18, 1948 г.).

Адміністрацыя, партыйная і прафсаюзная арганізацыі дарожна-будаўнічага ўпраўлення пры Мурманскім гарвыканкоме выказваюць падзяку за дапамогу ў будаўніцтве дарог у горадзе Мурманску.

Студэнцкі будаўнічы атрад вашага універсітэта (камандзір атрада Е. Цікуноў, камісар—А. Лапкоў) унёс вялікі ўклад у далейшае развіццё горада Мурманска. Студэнты паказалі сябе дысцыплінаванымі, працавітымі і актыўнымі таварышамі.

Дарожна-будаўнічае ўпраўленне гатова падтрымліваць сувязь з вашым універсітэтам і просіць накіраваць у 1969 годзе для работы ў нашым упраўленні 60—100 студэнтаў.

І. ГАРДЗЕЕЎ,
начальнік дарожна-будаўнічага ўпраўлення.
Н. САРАНСКІ,
сакратар партарганізацыі.
А. ПАЎЛАЎ,
26 жніўня 1968 г.



НА ДАПАМОГУ КАЛГАСУ. Фота М. НІЧЫПАРЭНКІ.

# СЦЯГІ НАД БУДОЎЛЯЙ

**У гэтым годзе шляхі дружбы прывялі ў Беларусь інтэрнацыянальны атрад у складзе студэнтаў Іенскага універсітэта імя Ф. Шылера (ГДР) і студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Месца прыкладання сіл — Салігоршчына.**

**Салігорск — адзін з многіх гарадоў нашай краіны, які вырас у апошняе дзесяцігоддзе. Салігорск — гэта веліч карпусоў і шахтныя капры калійных камбікатаў, гэта прасторныя жылыя кварталы. Цяпер у горадзе ўзводзіцца трэці калійны камбінат, які аб'яўлен Усесаюзнай камсамольскай ударнай будоўляй. І вось тут цэлы месяц працавала студэнцкая інтэрнацыянальная брыгада, аб'яднаная агульнай мэтай.**

**У тыя дні, калі фестывальная Сафія квітнела мноствам нацыянальных сцягоў і касцюмаў, студэнтаў двух сяброўскіх універсітэтаў радніў касцюм рабочага — камбінезон і гумавыя боты. А агульным домам на некаторы час ім стала будаўнічая пляцоўка. Упрыгожан быў гэты «дом» трыма сцягамі: СССР, БССР і Саюза свабоднай нямецкай моладзі. Маладыя будаўнікі Інго Бём, студэнт факультэта славістыкі, Роланд Хёлейн — фізік, нашы студэнты — Галіна Громава, Алег Цывес, Леанід Данілеўскі былі прыкладам узорнай працы. За чатыры тыдні інтэратрадам была засвоена 51,6 тысячы рублёў капіталаўкладанняў. Сіламі студэнтаў пабудаваны бетонны згушчальнік, адзін з дзесяткаў у сістэме вытворчасці.**

**У свабодны ад працы час —знаёмства з жыццём гарнякоў, цікавыя паездкі ў ваколіцы Салігорска, спартыўныя сустрэчы з мясцовымі футбалістамі і валейбалістамі, наведванні школ і дзіцячых садоў... і песні, песні. Яны гучалі на нямецкай і рускай мовах.**

**Той, хто пабываў на вечары інтэрнацыянальнай дружбы, бачыў, як падобны ў сваіх марах маладыя прадстаўнікі двух рэспублік. І хоць адны гаварылі на беларускай мове, іншыя на нямецкай, — усе гаварылі аб адным: «Няхай жыве дружба!».**

**Незаўважальна праляцелі чатыры тыдні, і трэба раставацца з работай, гасціннымі людзьмі, горадам, дзе застаецца ж часцінка тваёй працы. Напeрадзе экскурсійная паездка па Савецкаму Саюзу, наведванне крэпасці-героя Брэста, Вільнюса, Мінска і сталіцы нашай радзімы — Масквы.**

**Ніколі не забыць сустрэч з моладдзю горада над Бугам, гераічнага Брэста.**

**— Тыя дні, калі фашысты пакваліліся на жыццё людзей, не павінны паўтарыцца, — гаворыць Рудольф Аксель, кіраўнік групы студэнтаў з ГДР.**

**...Мы развіталіся, адчуваючы, што самым галоўным здабыткам была дружба, завязаная на салігорскай зямлі, замацаваная агульнай працай**

**У. НАУМЧЫК,**
камандзір інтэрнацыянальнага атрада, студэнт юрыдычнага факультэта.

*РЭПАРТАЖ*

# РОДНЫ ДОМ

Цёпла свецяцца вечарамі вокны інтэрнацыянальнага інтэрната. Гэты свет вабіць і запрашае. Бо кожнае акно—гэта толькі шкляная граніца асаблівага, непаўторнага ў сваім укладзе света пакою.

З усіх канцоў зямлі сабраліся тут жыхары. І кожнага вызначаюць нацыянальныя рысы, свае здольнасці і захапленні. Заглянем жа ў інтэрнат. Падымемся па ступеньках лесвіцы, па якіх штодзённа праходзяць сотнямі ног, пройдзем па калідоры. У які ж пакой заглянуць? Давайце вось у гэты... І адразу ж акунаемся ў плаўнае апавяданне пра Афганістан. Паволі і разам з тым горача расказваюць Абдул Гафур Султані і Мухамед Якуб Амані пра сваю радзіму, пра Кабул, пра традыцыі, звычаі свайго народа і, вядома, пра моладзь, яе жыццё, імкненні. І перад слухачамі, нашымі савецкімі студэнтамі Леанідам Данілеўскім і Аляксандрам Елісеевым акрэсліваюцца карціны далёкай і загадкавай краіны, у якой ім мабыць ніколі не давядзецца пабываць, але зачараванне якой ужо запалаліла іх.

Мы выходзім з пакою, ідзем далей. Вось з-за гэтых дзвярэй чуюцца галасы, абрыўкі гутаркі. Адчыняем— і адразу трапляем у цэнтр дыскусіі. Горача даказвае нешта Хасэ Луіс Брауліо. Але апаненты яго не здаюцца. Па ўсяму відаць, што спрэчка дасягнула апагея. У яе вадаварот ужо ўцягнуты ўсе прысутныя ў пакоі. Што ж, у спрэчках нараджаецца ісціна. Вось у такіх дыскусіях, у іншых гутарках вечарамі замежныя студэнты, якія прыехалі да нас вучыцца, яшчэ глыбей пазнаюць нашу рэчаіснасць; нашы жыццёвыя прынцыпы.

Каб зразумець краіну, трэба пабачыць многае. І нашы сябры пабывалі на заводах Мінска, гутарылі з рабочымі, школьнікамі, студэнтамі. Але гэтага не дастаткова. Трэба вось так вечарам пагаварыць, паспрачацца са сваім аднакурснікам, равеснікам, такім жа студэнтам, як і ты.

Іншыя пакоі — іншыя людзі. У 64-м насцярожаная цішыня. І аспірант фізічнага факультэта Нгуен Ван Тхоа і студэнт Рыгор Пучкоў працуюць. Толькі шэлест старонак ды скрып пяра па паперы парушаюць цішыню.

Наступны пакой — царства кніг. Яны ўсюды: на стале, на падаконніку, на полках на ўсю сцяну. І гаспадары яе В. Кавалеўскі, студэнт з Кубы Барыс Ла Сэрна схіліліся над кнігамі. Яны хімікі, разам вучацца, разам працуюць.

З леппакою нясуцца гукі песен, напяваюць мелодыю струны гітары і гукі яе, убаюканыя чатырма мужчынскімі галасамі, паволі расплываюцца па пакоі. Іх чацвёра: Джон Флетчар з Ганы, Архангел Бейсера з Венесуэлы, Віктар Леуцін і Уладзімір Анціпаў. Пачатак квартэту быў пакладзен ва універсітэцкім спортлагеры на Нарачы. Размешчаны на беразе прыгажэйшага у Беларусі возера, акружаны сонечнымі сасновымі лясамі, ён заўсёды прыцягвае студэнтаў. Многія з жыхароў інтэрнацыянальнага інтэрната пабывалі там. Чарльз Сомпал з Танзаніі, Гра Рафаэль з Кубы, в'етнамскі аспірант Нгуен Фыонг, студэнт фізічнага факультэта Рубіо Рамірэс Дэрбі прывязлі адтуль самыя цёплыя ўспаміны. У захапляючых спаборніцтвах, у далёкіх турысцкіх паходах, вечарамі паміж песен і спрэчак завязваюцца знаёмствы, якія пасля перарастаюць у дружбу. Так пазнаёміліся Архангел Бейсера і Віктар Леуцін. Пасля да іх далучыліся Джон Флетчар і Уладзімір Анціпаў. Узнік квартэт, квартэт чатырох фізікаў. Рэпертуар яго сапраўды інтэрнацыянальны. Яны спяваюць англійскія, лацінаамерыканскія, рускія песні. Часта выступае разам з імі і Барыс Ла Серна. На гарадскіх, універсітэцкіх студэнцкіх вечарах, на інтэрнацыянальных вечарах у іншых гарадах рэспублікі пяюць іх гітары. І разам з песняй падарожнічаюць слухачы: Англія, Куба, Венесуэла, Мексіка, Гавана. Звіняць струны, і сыплюцца ў зал гарачыя кубінскія рытмы, усміхаецца Карыбскае мора каля венесуэльскіх берагоў, пяюць вуліцы Гаваны...

Інтэрнат жыве сваім жыццём. Вось спяшаецца некуды старшыня студсавета інтэрната Мар'яна Верстак. Відаць, скора збіраецца студсавет: у інтэрната ёсць свае клопаты, праблемы. Насустрач нам ідзе група в'етнамскіх студэнтаў. Яны былі запрошаны на ўрачысты вечар у адзін з тэхнікумаў Мінска і цяпер вяртаюцца.

— Ну, як уражанне?

— О-о, вечар вельмі спадабаўся!

Ну, вось ужо і прыйшоў час развітвацца з сябрамі. Вы пакідаеце інтэрнат, які стаў домам для нашых замежных студэнтаў. Канчаецца дзень—адзін з многіх, які поўны дружбы і працы.

**М. ФЛЯКС,**
**студэнт.**

# ТУТ ГАСПАДАРАЦЬ СТУДЭНТЫ

У калідоры радыефізічнага корпуса ёсць дзверы, за якімі з ранку да позняга вечара меладычна спяваюць прыборы і шчоўкаюць адзін за другім выключальнікі. Гэта студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя. Яна была арганізавана у 1964 годзе, але па-сапраўднаму заявіла аб сабе зусім нядаўна. У мінулым годзе кафедра радыефізікі і электронікі ўзяла шэфства над маладымі даследчыкамі, выдзеліла для набыцця прыбораў неабходныя сродкі, і навуковая лабараторыя перарадзілася. Да навуковай працы былі прыцягнуты самыя таленавітыя студэнты факультэта.

Працай гэтай лабараторыі адразу ж многія зацікавіліся, і ў яе адрас пайшлі запросы і заказы. Першай вялікай работай для студэнтаў-выпускнікоў Леаніда Будзько, Аляксандра Сяргеева, Уладзіміра Мікуловіча і Мікалая Кібальніка быў іх удзел у выкананні аналагалічбавых пераўтваральнікаў сігналаў. Многа часу і энергіі аддалі студэнты гэтай працы, а іх даследаванні ляглі ў аснову дыпломных работ.

Студэнты чацвёртага курса фізфака Аляксандр Кубасаў, Віктар Сакалоў, Іван Лісеменка, Генадзь Красоўскі і Вечаслаў Ісаеў, ведаючы аб тым, што для транзістарных схем не хапае дабраякасных элементаў жыўлення, вырашылі удасканаліць існуючыя элементы. Доўгі пошук, і, нарэшце, арыгінальная схема выключна новай, высокаякаснай і малагабарытнай батарэйкі была знойдзена. Зараз рабятамі ўжо зроблена каля трыццаці такіх элементаў.

Няспынна расце майстэрства студэнтаў, якія займаюцца у навукова-даследчай лабараторыі, некаторых з іх ужо цяпер можна кваліфікаваць як інжынераў.

У хуткім часе, — гаворыць загадчык лабараторыі Уладзімір Мікуловіч, — наша лабараторыя яшчэ больш пашырыць кола сваёй дзейнасці. Сродкі, накопленыя за выкананне заказаў, ідуць на набыццё прыбораў і дэталей. Магчыма, што з нашай студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі ў будучым арганізуецца самастойны студэнцкі навуковы цэнтр.

**А. ПАУЛЯНКОЎ.**

# КАМСАМОЛЬЦЫ. НАВУКА. ЧАС.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

*чыла ліквідаванне непісьменнасці сярод дарослага насельніцтва. Камсамольцы прымалі актыўны ўдзел у рабоце створанага пры ўніверсітэце таварыства «Далоў непісьменнасць». У 1926 годзе было створана 316 пунктаў ліквідавання непісьменнасці, у якіх навучалася 1339 рабочых мінскіх прадпрыемстваў.*

*Для студэнтаў, якія ад'язджалі на канікулы, арганізоўваліся спецыяльныя даклады і кансультацыі. Так, напрыклад, у студзені 1928 года адказнымі партыйнымі і савецкімі работнікамі рэспублікі былі прачытаны студэнтам даклады: «Аб міжнародным і ўнутраным становішчы СССР», «Аб палітыцы партыі ў вёсцы», «Аб пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі БССР». Быў таксама праведзен семінар, на якім вывучалася пытанне аб палітыцы партыі ў вёсцы. Студэнты ў час канікул звязваліся з мясцовымі партыйнымі, камсамольскімі арганізацыямі і па іх заданню выконвалі вялікую палітыка-масавую работу.*

*Амаль усе камсамольцы ўдзельнічалі ў рабоце масавых добраахвотных арганізацый: МАДР (Міжнародная Арганізацыя Дапамогі Рэвалюцыянерам), ТСААВІЯХІМ (Таварыства Садзейнічання Авіяцыі і Хіміі), а таксама ў рабоце шматлікіх спартыўных гуртоў.*

*□ На 1 верасня 1960 года на ўліку ў камсамольскай арганізацыі універсітэта было 3050 камсамольцаў. Камсамольская арганізацыя з'яўляецца актыўным памочнікам партыйнай арганізацыі, рэктарата ў барацьбе за ўмацаванне вучэбнай дысцыпліны, павышэнні паспяховасці, у развіцці мастацкай самадзейнасці, спорта, у рабоце па ідэйнаму і палітычнаму выхаванню студэнтаў.*

*Камсамольская арганізацыя пад кіраўніцтвам партыйнага камітэта разам са студэнцкім прафсаюзам праводзіла вялікую палітычную, культурна-масавую работу на падшэфных прадпрыемствах, у школах Дзяржынскага раёна. На аўтазаводзе камсамольцы праводзілі заняткі з рабочымі, якія вучыліся ў вячэрніх школах, у тэхнікумах, на вячэрніх аддзяленнях інстытутаў. Яны дапамагалі рабочым у падрыхтоўцы да ўступных экзаменаў у вышэйшую школу, арганізоўвалі дыспуты, чыталі даклады і лекцыі, выступалі з канцэртамі мастацкай самадзейнасці.*

*□ Сёння на ўліку камсамольскай арганізацыі універсітэта каля васьмі тысяч членаў ВЛКСМ. Яны аб'яднаны ў дзевяць факультэцкіх арганізацый. Гэта вялікая армія рэзерва і памочніка партыйнай арганізацыі БДУ.*



*Гэты здымак зроблен у Іенскім універсітэце імя Ф. Шылера (ГДР) у час абароны кандыдацкай дысертацыі па філасофіі камсамольцам нашага універсітэта А. МІХАЙЛАВЫМ.*

# ЗАПАЛАНЁНЫЯ МУЗЫКАЙ

*У ПРЫГОЖАННЕ калектыва мастацкай самадзейнасці універсітэта — народны аркестр народных інструментаў, які ў 1967 годзе стаў лаўрэатам Усесаюзнага фестывалю самадзейнага мастацтва, прысвечанага 50-годдзю Савецкай улады.*

*З 1953 года калектывам нязменна кіруе Міхаіл Аркадзьевіч Лісіцын. На працягу 14 год аркестр пастаянна ўдзельнічае ва ўсіх аглядах, фестывалях і дэкадах самадзейнага народнага мастацтва Беларусі.*

*Добра ведаюць універсітэцкіх музыкантаў і за межамі рэспублікі: у Эстоніі і Літве, у Адэсе і Ленінградзе.*

*Усе 60 удзельнікаў аркестра — камсамольцы, усе паспяхова вучацца, нягледзячы на шматлікія канцэрты і выезды, усе з захапленнем займаюцца музыкай і, вядома, з сумам развітваюцца з калектывам, калі наступае час заканчэння вучобы ва універсітэце. А цяпер на рэпетыцыі побач можна бачыць пяцікурснікаў дамрыстаў Яўгена Басава, Юрыя Шынкара і першакурснікаў Ліду Аншакову і Мікалая Акімава, ветэранаў аркестра Аню Фрыдман, Ліду Палішчук, Алу Бірыла і навічкоў, якія толькі прыйшлі ў аркестр, але працуюць з падвоенай энергіяй.*

*Зараз калектыў аркестра напружана рыхтуецца да вялікага свята — юбілею Ленінскага камсамола і 50-годдзя рэспублікі і Кампартыі Беларусі.*

*У рэпертуары з'явіліся новыя творы: уверцюра да оперы Глінкі «Руслан і Людміла», Марш-Гратэск Бялецкага, беларуская полька Кулікова, беларускія і рускія песні і, вядома, песні, прысвечаныя камсамолу.*



*НА ЗДЫМКУ: народны аркестр народных інструментаў выступае з чарговым канцэртам. Дырыжыруе кіраўнік аркестра М. А. Лісіцын.*

# У ПОШУКАХ СКАРБАЎ

**Не памылюся, калі скажу, што для філолагаў дні фальклорнай практыкі застануцца ў памяці надоўга. І не толькі таму, што студэнты змаглі праверыць слушнасць некаторых тэарэтычных палажэнняў, засвоеных з лекцый, змаглі выкарыстаць свае веды ў працы, у так званых «палявых» умовах. Практыка праходзіла ў маляўнічых мясцінах Беларусі, у лепшую пару года — летам. А ўжо адно гэта так шмат значыць!**

**Студэнты аддзялення рускай мовы і літаратуры аблюбавалі для практыкі Брэстчыну — зямлю казак і легенд, зямлю герояў. Вось ужо каторы год яны ездзяць у самыя глухія куткі Палесся, па крупінках збіраюць чыстае золата народнай мудрасці, вяртаюць з забыцця жамчужыны роднай народна-паэтычнай творчасці. У студэнтаў беларускага аддзялення свая мэта: запісаць фальклор той тэрыторыі Беларусі, дзе яшчэ не ступала нага фалькларыстаў. Матэрыял такі патрэбны ім для запланаванага выдання—трохтомніка беларускіх народных песен, новых, нікім яшчэ не запісаных.**

**Трохтомнік рыхтуецца да друку пад кіраўніцтвам дацэнта Н. С. Гілевіча і з'явіцца даволі значнай падзеяй у нашай фалькларыстыцы.**

**Сёлета выявілася, што адна з «белых плям» на фалькларыстычнай карце Беларусі, як гэта не дзіўна, займала паўночны захад Міншчыны, амаль цэнтр нашай рэспублікі. Займала, бо сёння ні пра Маладзечанскі і Вілейскі, ні пра Валожынскі і Іўеўскі раёны гэтага не скажаш — там пабывалі нашы студэнты, адтуль прывезлі сотні сшыткаў цікавых, а часам і унікальных фальклорных запісаў.**

**З камсамольскім запалам, з агеньком працавалі філолагі на фальклорнай практыцы. Ды яны і не маглі інакш, асабліва ў сёлетні, юбілейны камсамольскі год.**

**Б. РАГОЙША,**
**старшы выкладчык, кандыдат філалагічных навук.**



# *На паэтычнай арбіце*

*Аўтары гэтай падборкі — члены літаратурнага аб'яднання «Узлёт» пры нашай газеце. Нягледзячы на іх камсамольскі ўзрост, яны ўжо добра знаёмы чытачу па рэспубліканскіх часопісах і газетах, маюць або рыхтуюць да друку свае першыя кніжкі. Юныя паэты — частыя госці на прадпрыемствах, у калгасах і школах. Сёння — яны гасцяць на старонцы нашай газеты.*

Алесь РАЗАНАЎ

## РАБОТА

Забываеш пра спёку і
стому,
Пра студзёную ласку вады,
Забываеш, што недзе ля
дому
Наліваюцца звонам сады,
Што гарбаціцца стэп
віядукам,
Што пылае, як спірт,
сінява,
Падуладныя генію гукаў
Дырыжору,
Якога няма.

## ШЧАСЦЕ

Твой недаступны лёс,
музыка,
Пасуе велічы тваёй —
Як неадкладную пазыку,
Як у глыбіні з галавой,
Да ачмурэласці,
Да стомы
Аддаць усё, усё аддаць,
І — неістотнаму — самому
Хадзіць, смяяцца,
уздыхаць.

●

Сяргей ЗАКОННІКАЎ

## *СУСТРЭЧА*

Добры дзень, карабель
пустыні,
Крутагорбы дзівак,
вярблюд!
Што свідруеш начамі
пустымі
Разамлелую, ў цыпках,
зямлю.

Ты не злуйся, што цішу
парушылі,
Не ўцякай за Кушум з усіх
ног.
Сінявокія беларусы
Зноў махаюць табе з дарог,

А на тварах першыя
ўсмешкі,
Першы пыл хрумсціць на
зубах.
І плывуць па калючых
сцежках
Нашы мары на двух гарбах.

* * *

Спіць жанчына. Людзі не
трывожце.
Соладка ёй спаць на мураве.
Рукі так раскінуты
прывольна,
І каснік ляжыць на галаве.
У жбанку бярозавік
халодны,
Вецер зблытаў пасмачкі
ільну.
Ніжай апускаюцца аблокі,
Каб калматай коўдрай
ахінуць.
Уздымаюцца спакойна
грудзі,
Сонца вусны сушыць
спакваля.
Паглядзіце, зразумейце,
людзі, —
Гэта ж дыхае сама зямля.
У жытах густых прапала
сцежка
Пад павевам буйных
каласоў.
Нібы вартаўнік, сяджу
на ўзмежку,
Каб не спудзіў хто шчаслівы
сон.
Пазіраю на яе, на пожню,
А зямля калышацца,
плыве...
Спіць жанчына. Людзі, не
трывожце.
Соладка ёй спаць на
мураве.

Мар'ян ДУКСА

* * *

**Не абмінай мой дом —**
**Ні днём, ні на змярканні,**
**Дзе я — заўжды,**
**Дзе гэтулькі святла.**
**Не з цэглы ён —**
**упартага чакання,**
**Нятпеючага зыркага цяпла.**
**Будзь лёгкай на ўспамін,**
**Нібы сцяжынка,**
**Што на шчаку даверліва**
**кладзе.**
**Прыдзі,**
**Нібы празрыстая**
**дажджынка —**
**І тут жа**
**Смага вуснаў прападзе.**
**Прынось трывожнасць.**
**У вачах трывожнасць,**
**Перада мной таемна**
**звечарэй...**
**Ды адпусці дахаты**
**асцярожнасць,**
**Каб марна не стаяла ля**
**дзвярэй.**

●

Рыгор СЕМАШКЕВІЧ

* * *

Прынеслі вяскоўцы з
Іспаніі
Многа крывавых ран
І дзіўную, мужную песню
З прыпевам: «No pasaran!»
Песню, якая пахне
Ветрам і сонцам Грэнады,
Якая грыміць,
Як грымелі
Мадрыдскія барыкады.
А я з сорак пятага,
А я з сорак пятага —
Равеснік Дня Перамогі
І выбуху першага
атамнага.
Сягоння вісіць
Над планетаю нашай
Гэтая бомба —
Мая равесніца страшная.
Устанем жа, аднагодкі,
І крыкнем за акіян
Людзям хілым і подлым:
«No pasaran!»

*З дзённіка студэнцкіх будаўнічых атрадаў матэматычнага факультэта*

# «АЛГАРЫТМ»

Мы — матэматыкі. Нас 34. Прыехалі ў саўгас імя Батурына пабудаваць тры жылых дамы, зернесховішча, глыбінны склад, зрабіць 200 тысяч самана....

Прайшоў месяц, і нам не сорамна азірнуцца назад: сапраўдны саманны гарадок з 125 тысяч штук самана, тры жыллёвых домікі — плён намаганняў брыгад саманшчыкаў Гены Мацвеева, сталяроў Лёшы Марозава, муляроў Федзі Яско і Барыса Тэйтэльмана.

Было б несумленна пакінуць у баку кухонную брыгаду. Са сталовай жа пачынаецца працоўны дзень. У іх заўсёды ёсць у запасе сазанавая юшка, якая здольна рассеяць самыя змрочныя хмары, што з'яўляюцца перад «Алгарытмам».

Але не хлебам адзіным жыве цалінны атрад. Надоўга запамятаюць рабяты Батурына лагер-спадарожнік «Алгарытма» з авіямадэльным гуртком Васі Юферава, з турысцкім — Валеры Супруна, футбольнай секцыяй Сярожы Конанава, валейбольнай — Васі Берніка і, вядома, з піянерважатай Тамарай Яўгеньеўнай Нуждавай. Вынікам работы масавіка Ані Кірэевай, Сярожы Конанава і ўрача атрада Ліды Лапанік з'явіліся два канцэрты і чатыры лекцыі перад насельніцтвам Батурына і Калёнага.

У атрадзе разгарнулася спаборніцтва за права называцца лепшай брыгадай. Брыгадзіру Дзіме Мазгову уручаецца пераходны вымпел. Працаваць хутка і якасна — вось наш дэвіз.

10-гадзінны рабочы дзень не перашкаджае трэніроўкам. Каманда валейбалістаў выйшла ў фінал розыгрышу кубка раёна...

Нас 34. Добрая палова атрада другі раз на цаліне. Праз тры тыдні мы пакінем гасцінны Казахстан, але ніколі не забудзем цалінных дзён.

# ІМЯ ГАГАРЫНА

**РАБІ ВЯЛІКАЕ, НЕ АБЯЦАЮЧЫ ВЯЛІКАГА.**

Піфагор.

Прозвішча: Студэнцкі будаўнічы атрад імя Ю. А. Гагарына.

Альма-матэр: матфак БДУ.

Узрост: камсамольскі.

Прафесія: матэматыкі-будаўнікі.

Род занятказ: самы разнастайны.

Ужо блізка той дзень, калі мы скажам цаліне: «Да пабачэння, да наступнага лета!». Але пакуль што праца ў самым разгары. А 40 дзён назад...

28 студэнтаў-матэматыкаў высадзіліся на планеце Цаліна ў пасёлку Чапаева. Задача, пастаўленая перад намі, была дакладнай і зразумелай: да канца працоўнага семестра здаць «пад ключ» шэсць жылых дамоў. Але перш за ўсё нам, закасаўшы рукавы, прышлося ўзяцца за саман. Затое цяпер увесь наш саман ператвараецца ў двухкватэрныя дамы.

Прайшло шэсць тыдняў, а на аб'ектах ужо няма работы землякопам, апалубшчыкам, бетоншчыкам, кладчыкам. На хаду трэба мяняць спецыяльнасць. Цяпер у пашане штукатуры і цесляры. Пройдзе яшчэ тыдзень, і тон на будоўлі будуць задаваць маляры і шкляры.

Праца працай, але не забываем мы і пра адпачынак. З вялікай увагай слухалі рабяты вершы Мішы Мосензона на кастры паэзіі. Цёпла сустрэлі жыхары Чапаева канцэрты, падрыхтаваныя нашым атрадам. А нашы сустрэчы па футболу збіраюць вялікую колькасць балельшчыкаў.

На мітынгу салідарнасці з народам В'етнама байцы атрада ганьбавалі амерыканскіх агрэсараў. Была паслана прывітальная тэлеграма IX Сусветнаму фестывалю моладзі і студэнтаў.

Пяцьдзесят юных чапаеўцаў і іх бацькі доўга будуць памятаць студэнтаў-гагарынцаў і піянерважатую Л. Кузняцову. У памяці рабят застануцца турысцкія паходы па роднаму краю, малыя алімпійскія гульні, беларускія песні ля піянерскага кастра. А цяпер поўным ходам ідзе падрыхтоўка да ваенізаванай гульні, КВН, развітальнага кастра.

Рэдактар А. НІКОЛЕНКА.

АТ 01418 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон—Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 1570.